**Дзятлаўскі раён** — раён у складзе Гродзенскай вобласці. Плошча раёна складае 1,5 тыс. км². Адміністрацыйны цэнтр — горад Дзятлава. Усяго налічваецца 227 населеных пунктаў, з іх 223 — сельскія.




**Раён арганізаваны:**

**з 15 студзеня 1940 г. - у складзе Баранавіцкай вобласці;**

**з 8 студзеня 1954 г. – у складзе Гродзенскай вобласці;**

**25 снежня 1962 г. раён расфарміраваны.**

**6 студзеня 1965 г. – адноўлены ў складзе Гродзенскай вобласці;**

**1990 г. – гарадскому пасёлку Дзятлава прысвоены статус горада.**

**Гістарычная даведка**

Тэрыторыя раёна ўваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага з XIII стагоддзя.

1795 год – пасля трэцяга падзелу рэчы Паспалітай тэрыторыя раёна ўвайшла ў склад Слонімскага павета Слонімскай губерніі Расійскай імперыі.

1708 год – у час Паўночная вайны Расіі са Швецыяй ў Дзятлаве стаялі на зімовых кватэрах галоўныя сілы рускай арміі на чале з А.Меньшыкавым.

1709 год – у студзені прыязджаў і прабыў тыдзень цар ПётрІ.

З 1801 года - в складзе Гродзенскай губерніі.

1812 год – летам праз Дзятлава адступала на ўсход рускае войска 2-й арміі П.Т.Баграціёна.

1915-1918 г.г. – тэрыторыю акупіравалі войскі кайзераўскай Германіі.

1919-1920 г.г. – тэрыторыю акупіравалі войскі Польшы.

1921 – 1939 г.г. – тэрыторыя раёна ўваходзіла ў склад Польшы.

1939 год – тэрыторыя раёна ўвайшла ў склад БССР.

З чэрвеня 1941 па ліпень 1944 г.г. –тэрыторыя раёна акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.



**З гісторыі**

Пасля вызвалення заходняй Беларусі ў верасні 1939 года 15 студзеня 1940 года быў утвораны Дзятлаўскі раён у складзе Баранавіцкай вобласці з раённым адміністрацыйным цэнтрам у гарадскім пасёлку Дзятлава. Колькасць насельніцтва пасёлка на той час складала 8,3 тысячы чалавек.

Затым была Вялікая Айчынная вайна. Дзятлаўскі раён быў адноўлены пасля вызвалення тэрыторыі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па просьбе кіраўнікоў раёна з 17 сакавіка 1945 года раённы цэнтр на два гады быў перанесены з Дзятлава ў Наваельню з ранейшым найменаваннем раёна.

З 8 студзеня 1954 года раён перададзены ў склад Гродзенскай вобласці. 25 снежня 1962 г. Дзятлаўскі раён быў расфармаваны і падзелены паміж Лідскім, Слонімскім і Наваградскім раёнамі. Аднак ужо 6 студзеня 1965 г. ізноў абвешчаны раёнам. У сакавіку 1965 года Дзятлава ізноў стала раённым цэнтрам.

У 1982 годзе ў Дзятлаўскі раён уваходзіла 248 паселішчаў, 3 гарадскія пасёлкі, 16 хутароў. Паводле кнігі “Памяць. Дзятлаўскі раён”, у складзе Дзятлаўскага раёна ў канцы XX стагоддзя меліся 227 паселішчаў.



**Прырода**

Тэрыторыя раёна знаходзіцца ў межах Верхнянёманскай нізіны на поўначы і захадзе, на ўсходзе — каля падножжа Навагрудскага ўзвышша. Рэльеф — узгорыста-раўнінны. Пераважае вышыня 140—200 метраў над узроўнем мора. Самы высокі пункт — 283 метры (на паўночны ўсход ад горада Дзятлава).



**Карысныя выкапні**: торф, пясчана-гравійны матэрыял, будаўнічыя пяскі, мел, гліны, сапрапелі, радонавыя воды.
Сярэдняя тэмпература студзеня −6,1 °C, ліпеня 17,6 °C. Ападкаў выпадае 620 мм у год. Вегетацыйны перыяд — 193 сутак. Працякае рака Нёман з прытокамі Моўчадзь (на ёй Гезгалаўскае вадасховішча) з Дзятлаўкай, Шчара з Пад'яваркай. Цячэ рака Ваўчанка. Лясы пераважна хваёвыя, займаюць 42 % тэрыторыі раёна.
Глебы дзярнова-падзолістыя, дзярнова-падзолістыя забалочаныя, дзярновыя і дзярнова-карбанатныя. Агульная плошча сельгасугоддзяў складае 66,1 тыс. га, з іх асушаных 14,6 тыс. га.

**Насельніцтва**

Насельніцтва раёна — 24,4 тыс. чалавек, гарадское насельніцтва складае 47 %. Сярэдняя шчыльнасць — 23 чал./1 км². Цэнтр раёна — горад Дзятлава. У складзе раёна гарадскія пасёлкі Казлоўшчына і Наваельня, 223 сельскія населеныя пункты, 10 сельсаветаў: Вензавецкі,

Войневіцкі, Данілавіцкі, Дварэцкі, Дзятлаўскі, Жукоўшчынскі, Казлоўшчынскі, Мяляхавіцкі, Новаяльнянскі, Парэцкі.

**Гаспадарка**

Сельская гаспадарка раёна прадстаўлена 15 сельскагаспадарчымі вытворчымі каапературамі. Асноўныя галіны сельскай гаспадаркі: мяса-малочная жывёлагадоўля, бульбаводства, вырошчваюць збожжавыя, кармавыя культуры, лён.

На тэрыторыі раёна дзейнічаюць прадпрыемствы харчовай і лёгкай прамысловасці, будаўнічых матэрыялаў, дрэваапрацоўчай прамысловасці.

Па тэрыторыі раёна праходзяць чыгуначная лінія Ліда — Баранавічы, аўтамагістраль Ліда — Слонім — Быцень, аўтадарога рэспубліканскага значэння Дзятлава — Навагрудак — Любча.




**Адукацыя і культура**

У раёне 17 сярэдніх, 5 базавых, 1 пачатковая школа, 1 гімназія, установа адукацыі «Казлоўшчынскае ДПТВ-191», 19 дашкольных установ, 28 клубаў, 38 бібліятэк, 3 бальніцы, 28 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, рэспубліканская туберкулёзная

бальніца «Наваельня», філіял "Санаторый «Радон» СКУП «Белаграздраўніца», дзіцячы аздараўленчы цэнтр «Баравічок», дзіцячы санаторый «Ластаўка».

У Дзятлаве з 1966 года працуе дзяржаўны гісторыка-краязнаўчы музей.






**Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Дзятлаўскага раёна**

Царква Праабражэння Госпадняга ў г. Дзятлава (1839);

Касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў г. Дзятлава (1648);

Царква святых апосталаў Пятра і Паўла ў в. Вензавец (1875);

Царква Узвіжання Крыжа Господняга ў в. Войневічы (1897);

Касцёл Цела Господняга ў в. Дварэц (1904);

Царква Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў в. Дварэц (пачатак 20 ст.);

Царква Свяціцеля Мікалая Цудатворцы ў в. Нагародавічы (2-я палова 19 ст.);

Барысаглебская царква ў в. Накрышкі (1836);

Касцёл Святых Анёлаў-Ахоўнікаў у в. Раготна (19 ст.);

Сядзіба Ігната Дамейкі ў в. Жыбарты (1819).

